З любоўю да Бога, з каханнем адзін да аднаго

Аўтар: Арцём Ткачук
07.02.2021 00:00



Св. Валянцін вядомы не толькі ў супольнасці Касцёла, але і ва ўсім свеце. Асаблівую папулярнасць ён набыў у закаханых пар, бо лічыцца іх нябесным заступнікам. Пра тое, ці існуе “другая палоўка” і якую ролю займае Божы Провід у перасячэнні жыццёвых шляхоў дзвюх асоб, распавядаюць маладыя сужэнствы. Наша знаёмства з Максімам пачалося ў пілігрымцы. Калі ўзгадваю абставіны сустрэчы, разумею, што яна была наканавана звыш. У 2011 годзе я ўпершыню вырашыла пайсці ў паломніцтва Гродна–Рось, да цудадзейнай фігуры Езуса Журботнага. Аднак напярэдадні збораў аказалася, што ніводная з сябровак не можа саставіць мне кампанію, а адну мяне не пускалі бацькі, бо была непаўналетняя і здалёк – з Індуры. †



Я засмуцілася, але літаральна ў апошні момант мяне выручыла адна дзяўчына. Так Езус Журботны здзейсніў цуд ужо на самым пачатку – насуперак абставінам я аказалася ўдзельніцай паломніцтва!

З будучым мужам пазнаёмілася ўжо пасля галоўных роскіх урачыстасцей, па дарозе на начлег. Была ноч, і з-за цемры мы амаль не разглядзелі твары адзін аднаго, але

нягледзячы на гэта, адчулі ўзаемную сімпатыю. Раніцай, вяртаючыся ў Гродна на аўтобусе, ужо разам спявалі набожныя песні, а на наступны дзень танцавалі “бельгійку” падчас забаўляльнай сустрэчы для ўдзельнікаў паломнітцва. Так і пачалі кантактаваць. Максім прыязджаў да мяне ў Індуру. Амаль усе сустрэчы праходзілі на прыкасцёльнай тэрыторыі: там адбываліся першыя шчырыя размовы, там здарыўся і першы пацалунак… Праз паўгады ён прызнаўся ў любові, але я з прызнаннем вырашыла крыху пачакаць. Бо каханне – гэта штосьці вытрыманае, праверанае часам або выпрабаваннямі.

У гісторыі нашых адносін важнае месца займае адзін эпізод. Праз тры гады пасля таго, як мы з Максімам сталі парай, я пазнаёмілася з пэўнай манскай супольнасцю… і закахалася ў лад жыцця сясцёр. Яны заўсёды былі радасныя, свяціліся прыгажосцю, нястомна славілі Бога танцам і спевам. Мяне пачалі няспынна агортваць думкі, каб пайсці ў кляштар. Калі падзялілася з Максімам, ён заплакаў. Упершыню ўбачыла яго слёзы. Пачала шмат маліцца аб распазнанні жыццёвага шляху і аднойчы, молячыся Святым Пісаннем, вырашыла адкрыць старонку Бібліі наўгад. І трапіла на словы з Кнігі прарока Ераміі: “Ці доўга табе бадзяцца, адпалая дачка? Бо Гасподзь стварыў на зямлі нешта новае: жонка выратуе мужа” (Ер 31, 22). Усе сумнені адразу зніклі, а далейшы лёс быў вызначаны.

Трапяткія ўспаміны выклікае і момант, калі Максім рабіў прапанову. У той час я знаходзілася ў невялічкім мястэчку ў Польшчы на місіях, куды была запрошана сваім сябрам і духоўным настаўнікам дамініканцам а. Томашам Мікам ОР. На працягу тыдня я давала сведчанні, арганізоўвала малітву, збірала ахвяраванні на адпачынак для моладзі. Пасярод усіх турбот прыехаў Максім і запрасіў мяне ў рэстаран. А. Томаш не пусціў мяне туды, бо была пад яго апекай, але я нават усцешылася. Адчувала, што Максім хоча прапанаваць руку і сэрца, а сустрэча ў рэстаране падавалася надта бальнай. У выніку спаткаліся мы ля касцёла: быў позні вечар, а на вуліцы пачынаўся ўраган. Ці не рамантыка? Максім працягнуў у падарунак фотаальбом, у якім павінны былі пачаць фіксаваць новы этап свайго жыцця, а з альбома выпаў пярсцёнак і пакаціўся… Напужаліся, але знайшлі.

Падчас шлюбу мы абодва былі шчаслівыя, бо ведалі: калі ў сужэнстве на першым месцы Бог, то і сямейнае жыццё будзе ўдалае. Сёння маем ужо супольны плён: цудоўнага сына Адрыяна і невялічкі бізнес. Праз інстаграм-старонку “Буцік БоБо” прадаём аўтарскія постэры, паштоўкі, календары і кубкі з хрысціянскай тэматыкай. Я займаюся распрацоўкай дызайна, а Максім – усімі арганізацыйнымі справамі. Усё на хвалу Пана!

З любоўю да Бога, з каханнем адзін да аднаго

Аўтар: Арцём Ткачук
07.02.2021 00:00



